# *§ 16–0. Грамадска-палітычныя рухі ў Беларусі ў XIX ст.

«ПЛАН АГІНСКАГА»
ФІЛАМАТЫ ФІЛАРЭТЫ
ДЗЕКАБРЫСТЫ
«ТАВАРЫСТВА ВАЕННЫХ СЯБРОЎ»
«ДЭМАКРАТЫЧНАЕ ТАВАРЫСТВА»
«МУЖЫЦКАЯ ПРАЎДА»
НАРОДНІКІ

**Фактары, якія паўплывалі на грамадска-палітычны рух у Беларусі напачатку XIX ст.**

**1. Праекты грамадска-палітычнага і культурнага развіцця Беларусі.** Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай Беларусь ператварылася ў частку Расійскай імперыі. На працягу XIX ст. з'яўляліся розныя праекты яе грамадска-палітычнага і культурнага развіцця. Іх прапаноўвалі прадстаўнікі расійскай адміністрацыі, мясцовыя арганізацыі і чыноўнікі, прадстаўнікі паланізаванай шляхты.




Прааналізуйце фактары, якія ўплывалі на грамадска-палітычны рух у Беларусі. Як вы лічыце, які з іх быў вызначальным? Сваю думку аргументуйце.

У 1810–1811 гг. прадстаўнік арыстакратычнага роду *Міхал Клеафас Агінскі* распрацаваў план стварэння **аўтаномнага** Вялікага Княства Літоўскага ў складзе Расійскай імперыі. Ён атрымаў назву *«План Агінскага»*. Праект пераўтварэнняў быў прадстаўлены імператару Аляксандру І, аднак далейшага развіцця не атрымаў, бо ў 1812 г. пачалася вайна з Напалеонам.

«План Агінскага»

**Аўтаномія** — права ўнутранага самакіравання, якое даецца асобнай тэрыторыі або народу, што кампактна жыве ў межах дзяржавы.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**З запіскі Міхала Клеафаса Агінскага імператару Аляксандру І аб адраджэнні Вялікага Княства Літоўскага. 15 мая 1811 г.**

Частка Польшчы, далучаная да Расійскай імперыі, склала калісьці асобнае самастойнае ўладанне — Літву... Жыхары яго спрадвеку дбалі пра свае правы, вылучаліся мужнасцю і любоўю да Айчыны... Я перакананы, што калі б з далучаных да Расіі польскіх зямель была ўтворана адна правінцыя, захавана імя Літвы і пакінуты яе старажытныя правы, і калі б з яе быў створаны асобны край са сваім кіраваннем, але ў якасці далучанай і ўключанай у склад Расійскай імперыі дзяржавы, дык тады іншаземны ўплыў пранікаў бы туды з цяжкасцю.

<...> Гэты крок парушыў бы праект Напалеона... і нават калі б такім чынам нельга было прадухіліць вайну, дык яна будзе адцягнута і дасць магчымасць Расіі падрыхтавацца да яе. Напалеон меў бы супраць сябе восем мільёнаў жыхароў, на якіх, як ён мяркуе, можна разлічваць.



*Міхал Клеафас Агінскі. Мастак Ф. К. Фабр. 1805 г.*

1. *Чым аўтар запіскі тлумачыў неабходнасць аднаўлення ВКЛ? Чаму ён лічыў, што гэта было выгадна Аляксандру І?*
2. *Якія словы ў дакуменце паказваюць на тое, што гаворка ідзе пра аўтаномію ВКЛ у складзе Расійскай імперыі?*

### Часовы ўрад ВКЛ

Падчас ваенных падзей 1812 г. частка беларускай шляхты, у прыватнасці князь Дамінік Радзівіл і яго прыхільнікі, спадзеючыся на магчымасць адраджэння ВКЛ, падтрымала Напалеона. Для кіравання тэрыторыямі быў створаны часовы мясцовы адміністрацыйны орган *«Камісія часовага ўрада Вялікага Княства Літоўскага» («Часовы ўрад ВКЛ»)*. Шляхта спадзявалася, што гэтыя дзеянні стануць крокам на шляху да адраджэння ВКЛ. Але для французскай адміністрацыі стварэнне Часовага ўрада ВКЛ было толькі спосабам прыцягнуць на свой бок мясцовую знаць і сродкам забеспячэння арміі рэкрутамі і фуражом. Пасля выгнання напалеонаўскіх войскаў з Расійскай імперыі Камісія перастала існаваць.

### Дзейнасць тайных таварыстваў

Планы грамадска-палітычнага пераўладкавання, нацыянальна-культурныя памкненні зараджаліся сярод навучэнскай моладзі, цэнтрам дзейнасці якой быў Віленскі ўніверсітэт. Там паўсталі тайныя студэнцкія аб’яднанні, якія вялі культурна-асветную дзейнасць, займаліся вывучэннем беларускай мовы і культуры, а таксама пад уплывам Французскай рэвалюцыі выступалі за ідэалы свабоды, роўнасці, сацыяльныя пераўтварэнні і дзяржаўнае пераўладкаванне. Многія арганізацыі прадстаўлялі радыкальны лагер польскага нацыянальнага руху, прыхільнікі якога выступалі за адраджэнне Рэчы Паспалітай з беларускімі землямі ў яе складзе.

Найбуйнейшымі і найбольш вядомымі студэнцкімі арганізацыямі былі *Таварыства філаматаў* («аматары ведаў») і *Таварыства філарэтаў* («аматары дабрачыннасці»).

У 1822 г. быў выдадзены рэскрыпт Аляксандра I аб забароне тайных таварыстваў, у выніку зробленых урадам захадаў іх дзейнасць спынілася. Для недапушчэння ўплыву заходняга вальнадумства былі ўведзены абмежаванні на навучанне за мяжой.

У 1830–1850-х гг. на тэрыторыі Беларусі папулярнасць набылі дэмакратычныя ідэі ліберальнага і рэвалюцыйнага характару. Як і раней, праваднікoм гэтых ідэй выступала студэнцкая моладзь. Дзяржаўна-палітычнае існаванне Беларусі яны па-ранейшаму бачылі ў складзе Рэчы Паспалітай. Асаблівая ўвага ўдзялялася сялянам, вывучаліся сялянскі побыт і традыцыі, прапаноўваліся ідэі паляпшэння іх эканамічнага становішча. Гэтыя ідэі актыўна пашыраліся пры дапамозе ўлётак і лістоў, праз агітацыйныя выступленні. У 1836 г. было створана *«Дэмакратычнае таварыства»* на чале з *Францам Савічам*. Таварыства падтрымлівала ідэі барацьбы супраць самадзяржаўя, пашырэння правоў сялян (у тым ліку надзялення зямлёй). У 1839 г. таварыства было выкрытае, яго ўдзельнікі арыштаваныя.

«Дэмакратычнае таварыства»



Ф. Савіч.
Невядомы мастак

У гэты ж час сярод беларускай інтэлігенцыі, якая тады зараджалася, фарміруецца ідэя адміністрацыйнай аўтаноміі для беларускіх і літоўскіх губерняў у складзе Расійскай імперыі. Яе прыхільнкі атрымалі назву «краёўцы». Яны займаліся вывучэннем і папулярызацыяй гісторыі і культуры Беларусі, падтрымлівалі выкарыстанне беларускай мовы. Сярод іх — Адам Кіркор, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч і інш.

Дзейнасць «краёўцаў»

**2. Нацыянальныя рухі ў Беларусі: прычыны, мэты, характар, плыні.** У XIX ст. нацыянальны рух у Беларусі быў абумоўлены яе нядаўнім уваходжаннем у склад Рэчы Паспалітай, прапольскім характарам мясцовых эліт, а таксама наяўнасцю прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей, якія жылі на тэрыторыі Беларусі.

Умовы фарміравання нацыянальнага руху

Паланізаваная шляхта з’яўлялася асновай польскага нацыянальнага руху на тэрыторыі Беларусі, які выступаў за адраджэнне Рэчы Паспалітай як польскай дзяржавы і разглядаў Беларусь як яе неад’емную частку.

Польскі нацыянальны рух

Ідэалогія заходнерусізму

**Заходнерусізм** — сістэма поглядаў, прыхільнікі якіх разглядалі беларусаў як частку трыадзінага (вялікарусы, беларусы, маларусы) тытульнага народа Расійскай імперыі.

Важную ролю ў працэсе дэпаланізацыі насельніцтва беларускіх губерняў адыгрывала ідэалогія **«заходнерусізма»**. Статыстычныя і этнаграфічныя матэрыялы, сабраныя прадстаўнікамі «заходнерусізма» ў час іх экспедыцый па Беларусі, змяшчалі доказы самабытнасці беларускай культуры, прыцягнулі ўвагу да асаблівасцей беларускага этнасу, у пэўнай меры спрыялі развіццю беларускай нацыянальнай ідэі. Гісторыкі гэтага кірунку першыя паказалі на вытокі адметнасці беларусаў на прыкладзе гісторыі Полацкай зямлі і ВКЛ да Крэўскай уніі.

Аднак ні польскі нацыянальны рух, ні заходнерусізм не разглядалі пытання наконт магчымасці ўзнікнення самастойнага дзяржаўнага ўтварэння на тэрыторыі Беларусі.

Нацыянальны рух яўрэйскага насельніцтва

Як вы лічыце, чаму на тэрыторыі Беларусі склаўся яўрэйскі нацыянальны рух? Якія фактары гэтаму спрыялі?

Нацыянальны рух прадстаўнікоў яўрэйскага насельніцтва аформіўся бліжэй да канца XIX ст. і быў звязаны са стварэннем грамадскіх і партыйных арганізацый, заснаваных на членстве паводле нацыянальнай прыкметы. Гэта былі арганізацыі рабочых, якія фарміраваліся і дзейнічалі пераважна ў гарадах. Першапачатковыя іх мэты заключаліся ў барацьбе за паляпшэнне становішча яўрэйскіх рабочых і эканамічныя пераўтварэнні. Яўрэйскія нацыянальныя арганізацыі наладжвалі сувязі як з польскімі, так і з расійскімі арганізацыямі сацыял-дэмакратычнага характару.

XIX ст. было часам фарміравання нацыянальных ідэй у дзяржавах Усходняй Еўропы. Фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі вучоныя адносяць да другой паловы XIX ст.

Патрыятычнае таварыствы

### 3. Польскае пытанне і шляхецкія паўстанні.

Польская шляхта імкнулася адрадзіць Рэч Паспалітую ў межах 1772 г. Гэта значыць, што яе інтарэсы закраналі і тэрыторыю Беларусі. Такіх самых пазіцый прытрымлівалася частка паланізаванай

беларускай шляхты. Напачатку 1820-х гг. было ўтворана польскае *«Патрыятычнае таварыства»*. Яно разлічвала на саюз з рускімі дзекабрыстамі з мэтай арганізацыі супольнага паўстання і адраджэння Рэчы Паспалітай. Аднак дзекабрысты гатовыя былі прызнаць права незалежнасці толькі за Польшчай (выключаючы тэрыторыю Беларусі). У 1826 г. удзельнікі «Патрыятычнага таварыства» былі арыштаваны і аддадзены пад суд.

**Паўстанне 1830–1831 гг.**

Спробай польскай шляхты адрадзіць Рэч Паспалітую ў межах 1772 г. было паўстанне 1830–1831 гг. Яно пачалося ў Варшаве ў 1830 г., разрозненыя паўстанцкія атрады дзейнічалі ў заходніх рэгіёнах Беларусі. Кіраўнікі паўстання знаходзіліся на тэрыторыі Польшчы. Для каардынацыі дзеянняў на тэрыторыі беларускіх і літоўскіх губерняў быў створаны *Віленскі цэнтральны паўстанцкі камітэт*. Паўстанне падтрымала частка прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя, якія жадалі ўключыць тэрыторыю Беларусі ў склад Рэчы Паспалітай і атрымаць палітычныя прывілеі. Для сялян, якія заставаліся прыгоннымі, заклікі паўстанцаў не ўяўлялі цікавасці. Не атрымалі шырокай падтрымкі ідэі паўстання і сярод мяшчан. Расійскі ўрад, імкнучыся не дапусціць удзелу шырокіх мас насельніцтва ў паўстанні, абвясціў пра памілаванне тых, хто добраахвотна пакіне паўстанцкія атрады.

Як вы лічыце, чаму сяляне і мяшчане не прынялі масавага ўдзелу ў паўстанні?

Паўстанцаў аслабляў і ўнутраны раскол. Удзельнікі паўстання падзяліліся на два кірункі — дэмакратычны і кансерватыўны.

У жніўні 1831 г. паўстанне было падаўлена. На тэрыторыі Беларусі ўвялі шэраг абмежавальных мерапрыемстваў для памяншэння польскага ўплыву.

**Паўстанне 1863–1864 гг.**

Наступнай спробай рэстаўрацыі Рэчы Паспалітай было паўстанне 1863–1864 гг. Паўстанцы, як

**Удзельнікі паўстання 1830–1831 гг.**

| Дэмакратычны кірунак | Кансерватыўны кірунак |
| --- | --- |
| выступалі за адраджэнне Рэчы Паспалітай і за далейшыя пераўтварэнні ў дзяржаве, у тым ліку за надзяленне сялян зямлёй | выступалі за адраджэнне Рэчы Паспалітай у ранейшым выглядзе, без ніякіх пераўтварэнняў |



*Іаахім Лялевель*



*Адам Чартарыйскі*

Параўнайце дэмакратычны і кансерватыўны кірункі паўстання. Якую агульную мэту яны мелі? У чым адрозненні паміж гэтымі кірункамі?

і ўдзельнікі польскага паўстання 1830–1831 гг., не ўзнімалі пытання аб стварэнні нацыянальнай беларускай дзяржаўнасці. Прадстаўнікі «белай» плыні ў паўстанні імкнуліся да адраджэння Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. з уключэннем у яе склад зямель Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны шляхам дыпламатычнага ціску заходнееўрапейскіх краін на расійскі ўрад. «Чырвоны» лагер прапаноўваў ідэю аб стварэнні «дэмакратычнай дзяржавы» ў ходзе нацыянальна-вызваленчага руху.

Аднак рэальнай іх мэтай было адраджэнне Рэчы Паспалітай як польскай дзяржавы. Цэнтрам падрыхтоўкі паўстання зрабіліся польскія землі. У 1862 г. у Варшаве быў створаны *Цэнтральны нацыянальны камітэт*, для каардынацыі дзеянняў на тэрыторыі Беларусі і Літвы — *Літоўскі правінцыяльны камітэт* у Вільні. Яго ўзначаліў **Кастусь Каліноўскі**, які не бачыў самастойных перспектыў для Беларусі.

Паўстанне пачалося ў Варшаве ў студзені 1863 г. Ахапіла пераважна заходнія тэрыторыі Беларусі. У Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях існавалі асобныя ачагі паўстання. Сярод паўстанцаў не было адзінства.



**«Мужыцкая праўда»**

Для пашырэння сваіх ідэй прадстаўнікі «левага» крыла ў 1862–1863 гг. выдавалі нелегальную газету «Мужыцкая праўда» (лацінкай на беларускай мове, выйшла 7 нумароў). Большая частка матэрыялаў для газеты была напісаная К. Каліноўскім пад псеўданімам *«Яська — гаспадар з-пад Вільні»*.

**Падаўленне паўстання**

Паводле складу ўдзельнікаў паўстанне было шляхецкае, паводле сваіх нацыянальных задач — польскае. У 1863 г. расійскі ўрад з мэтай прыцягнуць сялян на свой бок абвясціў шэраг ільгот і паслабленняў для сялян заходніх губерняў у правядзенні сялянскай рэформы 1861 г. Іх пачалі прыцягваць для нагляду за польскімі памешчыкамі-паўстанцамі. Для задушэння паўстання была прыцягнутая армія. Віленскім генерал-губернатарам быў прызначаны *М. М. Мураўёў*, які ўжываў жорсткія меры ў адказ на тэрор паўстанцаў. У 1864 г. паўстанне было задушана. Працягнуліся абмежавальныя мерапрыемствы, узмацнілася дэпаланізацыя, буржуазныя рэформы праводзіліся на тэрыторыі Беларусі з абмежаваннямі і адтэрмінаваннем.

Успомніце, якія дадатковыя ўмовы сялянскай рэформы 1861 г. увёў для беларускіх сялян расійскі ўрад.

**Дзейнасць дзекабрыстаў**

**4. Уплыў расійскага грамадска-палітычнага руху.** Напачатку 1820-х гг. у Расійскай імперыі пашыраліся ідэі, накіраваныя на барацьбу з самадзяржаўем, якія выліліся ў паўстанне дзекабрыстаў на Сенацкай плошчы ў Пецярбурзе ў снежні 1825 г. Дзекабрысты ў большасці сваёй былі афіцэрамі расійскай арміі. Многія з іх служылі ў Беларусі.

Ідэі дзекабрыстаў атрымалі падтрымку сярод часткі афіцэраў на тэрыторыі Беларусі. Напрыклад, у Бабруйскай крэпасці быў распрацаваны нерэалізаваны *«бабруйскі план паўстання»*, паводле якога планаваўся арышт імператара Аляксандра I падчас яго знаходжання ў крэпасці.



*М. Рукевіч. Невядомы мастак*

У Мінску дзекабрыст Мікіта Мураўёў распрацаваў першы варыянт праекта канстытуцыі, які атрымаў назву «мінскі».

У 1825 г. непадалёк ад Беластока былы філарэт *Міхаіл Рукевіч* стварыў *«Таварыства ваенных сяброў»*. Удзельнікі таварыства намагаліся сарваць прысягу на вернасць імператару Мікалаю I, але спроба была няўдалая, арганізатараў адправілі на катаржныя работы ў Сібір.

**Прыцягненне да грамадска-палітычнага руху сялян**

Праекты грамадска-палітычнага ўладкавання, афармленыя ў асяродку вышэйшых пластоў насельніцтва (дваранства і шляхты), не ўлічвалі інтарэсаў сялянства, якое складала большую частку насельніцтва як беларускіх губерняў, так і ўсёй Расійскай імперыі, а значыць, не маглі разлічваць на падтрымку шырокіх мас насельніцтва. Гэтая акалічнасць прывяла да разумення неабходнасці прыцягнення да грамадска-палітычнай барацьбы прадстаўнікоў сялянскага насельніцтва.

**Народніцкі рух**

У 1870-я гг. на тэрыторыі Расійскай імперыі ўзнікае *народніцкі рух*. Народнікі выступалі за найхутчэйшае вырашэнне сялянскага пытання. Сярод народнікаў пераважалі прадстаўнікі інтэлігенцыі, навучэнскай моладзі. Для агітацыі сялян і пашырэння сваіх ідэй яны выкарыстоўвалі практыку «хаджэння ў народ», але шырокай падтрымкі сярод сялян так і не атрымалі.

> Растлумачце, чаму народніцкі рух атрымаў такую назву.

**Зараджэнне сацыял-дэмакратычнага руху**

На змену народніцтву прыйшлі *ідэі сацыял-дэмакратыі*. Сацыял-дэмакраты выступалі за сацыялістычную рэвалюцыю з апорай на рабочых, стварэнне грамадства роўнасці і дэмакратыі без класавага падзелу і эксплуатацыі. Менавіта сацыял-дэмакраты для дасягнення сваіх мэт і ажыццяўлення палітычнай барацьбы пачалі ствараць першыя палітычныя партыі на тэрыторыі Расійскай імперыі.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**Часопіс «Гоман» (1884 г.)**


ГОМОН

Бѣлорусское соціально-революціонное обозрѣніе

№ 1

Содержаніе

От редакціи.
Роль мѣстных революц. групп.
Воззваніе к Бѣлорус. интеллиг.
Воззваніе конституціоналистов.
Общество „освобожд. труда“

Корреспонденція из Вильны.
" " Петербурга.
" " Кіева.
" " Витебска.
" " Харькова.

- 1884 -

Звернемся да нашай Радзімы. Гэтая краіна мае ўсе арыгінальныя адметнасці, якія надаюць ёй своеасаблівую фізіяномію і самым натуральным чынам вылучаюць яе як асаблівую галіну славянскага племені. Яе кліматычныя і этнаграфічныя ўмовы — гэта непраходныя балоты і тут жа тыя сыпучыя пяскі, гэта зліццё азёр і прытокаў Дняпра, Нёмана і Дзвіны — рэзка адрозніваюць краіну ад яе суседзяў — Вялікаросіі, Польшчы і Маларосіі. Народ, што жыве тут, дзякуючы непраходнасці балот, пяскоў і лясоў, якія цяпер чэзнуць, захаваў дасюль чысты тып славянскага племені.

Дык вось, мы — беларусы, таму мы маем змагацца ў імя мясцовых інтарэсаў беларускага народа і федэратыўнай аўтаноміі краіны; мы — рэвалюцыянеры, таму што, падзяляючы праграму барацьбы «Народнай волі», лічым неабходным прыняць удзел у гэтай барацьбе; мы — сацыялісты, бо нашай галоўнай мэтай з'яўляецца эканамічнае паляпшэнне краіны на пачатках навуковага сацыялізму. Вось асноўныя палажэнні праграмы, якія выразна маглі б вызначыць аддаленыя мэты і найбліжэйшую практычную дзейнасць беларусаў.

1. *Якія фактары, на думку сябраў суполкі «Гоман», дазволілі беларускаму народу захаваць сваю ўнікальнасць?*
2. *Якія тэрыторыі былі вызначаныя як месца пражывання беларускага народа?*
3. *Якую палітычную мэту ставілі ўдзельнікі суполкі «Гоман»? Якім чынам яны хацелі яе дасягнуць?*

**Грамадска-палітычнае жыццё пасля паўстання 1863–1864 гг.**

**5. Дзейнасць народніцкіх арганізацый. Народніцтва і нацыянальнае пытанне.** Пасля паўстання 1863–1864 гг. у грамадска-палітычным жыцці Беларусі назіралася значнае памяншэнне ўплыву польскага грамадска-палітычнага руху. Разам з тым грамадска-палітычная думка ў Беларусі ўсё больш развівалася ў рэчышчы працэсаў, што адбываліся па ўсёй тэрыторыі Расійскай імперыі.

1870-я гг. зрабіліся часам узнікнення народніцкіх арганізацый.

Праграмныя патрабаванні народнікаў

Народнікі выступалі за найхутчэйшае вырашэнне сялянскага пытання шляхам усталявання «сялянскага сацыялізму» пры дапамозе рэвалюцыі. Адным з важных пунктаў іх праграмы было права нацый на самавызначэнне. Сярод народнікаў пераважалі прадстаўнікі інтэлігенцыі, навучэнскай моладзі. Для агітацыі сялян і пашырэння сваіх ідэй яны выкарыстоўвалі метад «хаджэння ў народ», але шырокай падтрымкі сярод сялян так і не атрымалі.

Народніцкія арганізацыі

Першай народніцкай арганізацыяй зрабілася «Зямля і воля», створаная ў 1876 г., якая пазней, у 1879 г., раскалолася на «Народную волю» і «Чорны передзел». Найбольш актыўныя групы народнікаў у Беларусі існавалі ў Мінску, Магілёве, Гродна, Горках. У 1882 г. у Вільні дзейнічала Паўночна-Заходняя арганізацыя «Народнай волі».

Суполка «Гоман»

Адным з цэнтраў дзейнасці беларускіх народнікаў зрабіўся Пецярбург, дзе навучаліся ўраджэнцы Беларусі. У 1884 г. яны стварылі суполку «Гоман» на чале з Аляксандрам Марчанкам і Хаімам Ратнерам. Менавіта на старонках іх нелегальнага друкаванага часопіса «Гоман» упершыню было заяўлена пра існаванне беларускай нацыі і яе права на нацыянальна-дзяржаўнае самавызначэнне. Пасля забойства нарадавольцам Ігнатам Грынявіцкім (ураджэнцам Беларусі) імператара Аляксандра II у 1881 г. пачаўся перыяд рэакцыі. Народніцкія арганізацыі спынілі сваё існаванне.

Першыя заявы пра існаванне беларускай нацыі

**6. Узмацненне ўплыву праваслаўнай царквы. Каталіцтва. Міжканфесійныя адносіны.** Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай канфесійная палітыка на тэрыторыі Беларусі былі скіраваная на падтрымку праваслаўнай царквы, аднак не выключала існавання іншых хрысціянскіх і нехрысціянскіх

канфесій. Толькі пасля няўдалых спроб польскіх шляхецкіх паўстанняў аднавіць Рэч Паспалітую і ўдзелу ў іх часткі беларускай шляхты былі зроблены больш актыўныя абмежавальныя захады ў дачыненні да каталіцкай царквы, уніяцкая канфесія была скасаваная.

**Праваслаўе**

Стаўленне да праваслаўя вызначалася зыходзячы з пастулата «Самадзяржаўе. Праваслаўе. Народнасць», які быў сфармуляваны ў перыяд праўлення Мікалая I і заклікаíны адлюстроўваць унікальны шлях развіцця Расійскай імперыі ва ўмовах нарастання дэмакратычных рухаў у заходнееўрапейскіх дзяржавах. Пераход з іншых рэлігій у праваслаўе вітаўся і падтрымліваўся. Змена праваслаўя на іншую канфесію была забаронена. У другой палове XIX ст. разгарнулася актыўнае будаўніцтва праваслаўных храмаў і манастыроў. Пашыралася сетка праваслаўных навучальных устаноў, у першую чаргу пачатковага ўзроўню (царкоўна-прыходскія школы), у якіх разам з арыфметыкай і граматыкай вялікая ўвага надавалася вывучэнню Закону Божага і іншых рэлігійных дысцыплін. Духоўныя семінарыі дзейнічалі ў Вільні, Мінску, Магілёве, Полацку (у 1856 г. пераведзена ў Віцебск). Праваслаўная царква на тэрыторыі Беларусі знаходзілася пад юрысдыкцыяй Свяцейшага сінода і падзялялася на епархіі. На працягу XIX ст. колькасць праваслаўных епархій на тэрыторыі Беларусі павялічвалася. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай іх было дзве — Магілёўская (адзіная да 1793 г.) і Мінская. Да пачатку XX ст. былі створаныя яшчэ Полацкая, Віленская і Гродзенская епархіі.

**Уніяцтва**

Напачатку XIX ст. большая частка насельніцтва Беларусі, якую складалі пераважна сяляне, вызнавала ўніяцтва. Існавала даволі вялікая колькасць уніяцкіх парафій і навучальных устаноў. У 1828 г. была адкрыта Жыровіцкая духоўная се-

мінарыя для падрыхтоўкі ўніяцкага духавенства (сёння ў Жыровічах размяшчаецца праваслаўная Мінская духоўная семінарыя са статусам вышэйшай навучальнай установы). Такая сітуацыя захоўвалася да 1839 г., калі рашэннем Полацкага царкоўнага сабору было здзейснена ўз'яднанне ўніяцтва з праваслаўнай царквой. Значную ролю ва ўз'яднанні цэркваў адыграў на той момант уніяцкі біскуп Язэп Сямашка, які пазней стаў праваслаўным мітрапалітам (Літоўскім і Віленскім).

### Каталіцтва

У канцы XVIII — пачатку XIX ст. каталіцтва было пашырана пераважна ў заходніх рэгіёнах Беларусі. Памяркоўнае стаўленне расійскіх улад да каталіцкай царквы змянілася ў выніку паўстанняў 1830–1831 і 1863–1864 гг. Набажэнствы праводзіліся на рускай мове, многія культурныя і навучальныя ўстановы закрываліся, абмяжоўваліся маёмасныя правы каталіцкай царквы. Пасля здушэння паўстання 1863–1864 гг. паскорыўся пераход каталікоў у праваслаўе. Разам з тым напрыканцы XIX ст. каталіцкая царква займала трэцяе месца паводле колькасці вернікаў у Беларусі.

### Іншыя канфесіі

Традыцыйна тэрыторыя Беларусі была месцам мірнага суіснавання прадстаўнікоў розных канфесій. Перыяд у складзе Расійскай імперыі не зрабіўся выключэннем. Апроч згаданых тут жылі пратэстанты, стараверы, іўдзеі, мусульмане. Ім дазвалялася мець свае прыходы, храмы, малітоўныя дамы, навучальныя ўстановы, выконваць абрады.

У 1905 г. у Расійскай імперыі быў прыняты ўказ «Аб умацаванні пачаткаў верацярпімасці», згодна з якім вернікам давалася магчымасць пераходу з праваслаўя ў іншую хрысціянскую канфесію, а таксама ў нехрысціянскую рэлігію ў тых выпадках, калі людзі, якія жадалі перайсці, або іх продкі раней ужо належалі да гэтай рэлігіі.

## КАНФЕСІЙНАЯ СТРУКТУРА БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСТВА ПАВОДЛЕ ПЕРАПІСУ 1897 г.




Прааналізуйце, як змянілася канфесійная структура беларускага грамадства ў XIX ст. Вызначыце фактары, якія спрыялі такім зменам. Дакажыце, што беларускае грамадства напрыканцы XIX ст. было поліканфесійнае.

*На працягу XIX ст. шляхецкія ідэі адраджэння Рэчы Паспалітай як фактычна польскай дзяржавы паступова саступалі месца ідэям нацыянальна-дзяржаўнага вызначэння Беларусі і сацыяльнай роўнасці. Тайныя таварыствы і гурткі саступалі месца палітычным партыям і арганізацыям.*

| **калі ў свеце...** | **на тэрыторыі Беларусі...** |
| --- | --- |
| 1885 г. — створаны Індыйскі нацыянальны кангрэс | 1884 г. — першая заява пра існаванне беларускай нацыі |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Якія былі асаблівасці грамадска-палітычнага руху на тэрыторыі Беларусі ў XIX ст.? Якія праекты грамадска-палітычнага і культурнага развіцця Беларусі былі створаны ў гэты перыяд?
2. Ахарактарызуйце мэты і вынікі польскага нацыянальнага руху на тэрыторыі Беларусі ў XIX ст. Які быў сацыяльны склад удзельнікаў гэтага руху?
3. Што такое ідэалогія заходнерусізму? Ацаніце яе значэнне ў гісторыі Беларусі XIX ст.
4. Якія фактары аказалі ўплыў на грамадска-палітычны рух на тэрыторыі Беларусі ў XIX ст.? Канкрэтызуйце свой адказ прыкладамі.
5. Хто і калі ўпершыню заявіў пра існаванне беларускай нацыі і самастойныя задачы беларускага нацыянальна-культурнага руху?
6. Якія змены адбыліся ў канфесійнай палітыцы расійскага ўраду на беларускіх землях на працягу XIX ст.? Як гэта было звязана з грамадска-палітычнымі падзеямі, што адбываліся ў Беларусі?